Віват Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту!

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»

20 кастрычніка 2026 года, №10 (2314)

З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ, БДУ!

Паважаныя калегі, студэнты, уся супольнасць Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта!

Прыміце шчырыя віншаванні са 105-годдзем БДУ!

З БДУ пачынаецца гісторыя вышэйшай адукацыі, універсітэцкай сістэмы і навукі ў Беларусі. І сёння ён адзіны з усіх беларускіх універсітэтаў уваходзіць у першыя працэнты найлепшых ВНУ ў свеце, а нашы навукоўцы – сярод найбольш цытаваных беларускіх аўтараў. БДУ – лідар у Беларусі па колькасці падрыхтаваных навукоўцаў, публікацый у міжнародных часопісах базы даных Web of Science, у навучанні замежнікаў. Мы ўладальнікі прэміі ўрада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці, у якую ўкладзены праца кожнага супрацоўніка і студэнта БДУ, час і імкненне быць лепшым, чым учора. Мы ўмацоўваем сувязі і пераемнасць пакаленняў, цэнім сапраўднае жыццё ўніверсітэта, дзе ёсць маладосць, досвед, унікальнасць, рознасць, асяроддзе для росту і развіцця кожнага.

Адказваючы на выклікі часу, сваімі дасягненнямі ўніверсітэт сам адважна змяняе рэальнасць і робіць выклікі ў галіне медыцыны, космасу, IT, паднімае планку сабе і ўсім, хто ідзе за намі. Супрацьпухлінныя прэпараты, нана- і пікаспадарожнікі, біятэхналогіі, міжнародныя пастаменты замацоўваюць за БДУ статус лідара. Гэта, бясспрэчна, цяжка, часам нават на грані роспачы і безвыходнасці. Але гісторыя паказала, што БДУ не баіцца цяжкасцяў. Новыя патрабаванні даюць імпульс да развіцця ўніверсітэта, раскрыцця яго патэнцыялу і пошуку новых рэсурсаў.

«Быць заўсёды першым!» – гэта пастаянная невядомасць і непрадказальнасць, непратаптаная сцяжына да новых і цікавых рашэнняў. Я ўдзячны ўсяму калектыву БДУ за яго адвагу ісці разам па гэтым шляху, за той асабісты і агульны ўклад, які робіць наш рух стваральным і змястоўным.

Я віншую ўсіх нас з юбілейнай датай БДУ, жадаю ўсім міру і разумення, чутнасці сябе, іншых і такту часу, адчування дачынення да самога ўніверсітэта, яго гісторыі і сучаснасці. Дарагія людзі БДУ, здароўя ўсім нам, настрою, поспехаў, новых дасягненняў, радасці! Хай місія БДУ застаецца нязменнай, а яго ўплыў толькі расце і ўмацоўваецца на карысць нашай адукацыі і роднай Беларусі!

Са святам, дарагі ўніверсітэт!

З павагай,
рэктар БДУ Андрэй Кароль



1921/1922 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД: ПЕРШЫЯ КРОКІ

Дэбютны навучальны год універсітэта стаў сапраўдным прарывам, які заклаў падмурак вышэйшай адукацыі ў маладой краіне, што прадвызначыла яе будучыню: культурны ўздым грамадства, фарміраванне нацыянальнай інтэлігенцыі і падрыхтоўку высакакласных спецыялістаў. Давайце перанясёмся на 105 гадоў назад, каб даведацца, чым запомніўся гістарычны 1921/1922 навучальны год.

АДКРЫЦЦЁ

Урачыстае адкрыццё БДУ прайшло 11 ліпеня 1921 года ў будынку Мінскага гарадскога тэатра ў прысутнасці членаў урада, прадстаўнікоў грамадскасці, навукоўцаў. Адразу пасля гэтага пачалася падрыхтоўка да заняткаў на двух першых факультэтах – медыцынскім і грамадскіх навук (ФГН). Далей да іх далучыўся рабочы.

ІМЁНЫ

Сярод першых супрацоўнікаў – В. Г. Кнорын (палітэканоміі), У. М. Ігнатоўскі (гісторыя Беларусі), У. М. Іваноўскі (філасофія і педагогіка), І. М. Салаўёў (педагогіка), М. М. Нікольскі (гісторыя), М. Я. Янчук (этнаграфія), С. Я. Вольфсан (эканоміка), Я. Я. Свяцлаўскі (статыстыка), М. М. Андрэеў (фізіка), Б. М. Беркенгейм (хімія), М. Б. Кроль (медыцына), П. І. Карузін (анатомія), А. У. Фядзюшын (заалогія). Якасць падрыхтоўкі першых спецыялістаў краіны залежала ад выкладчыкаў. У цяжкія рэвалюцыйныя гады ў Мінск ехалі тыя, хто шукаў не проста сродкі да існавання, а магчымасці для навуковага і творчага росту. Гарантам рэалізацыі гэтых мэт выступала імя У. І. Пічэты.

ПЕРШАЯ ЛЕКЦЫЯ

Урачысты пачатак заняткаў у БДУ адбыўся апоўдні 30 кастрычніка 1921 года. На свяце сабраліся прафесары, выкладчыкі, студэнты, а таксама прадстаўнікі партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва краіны. Пасля выступленняў афіцыйных асоб і абвяшчэння вітальных тэлеграм з дакладам пра праробленую працу і першачарговыя задачы выступіў рэктар. Далей былі прадстаўлены два навуковыя даклады – «Школа і задачы навуковай педагогікі» (прафесар Салаўёў), «Мысленне і мова» (прафесар Кроль).

А ўжо 31 кастрычніка прафесар Д. П. Канчалоўскі правёў для студэнтаў самую першую лекцыю «Культура Міжземнамор'я ў эпоху панавання Рыма».

СТУДЭНТЫ

Інфармацыя пра набор слухачоў друкавалася ў перыядычных выданнях. У маі 1921 г. быў абвешчаны прыём студэнтаў на рабочы факультэт і падрыхтоўчыя курсы пры ім. Газета «Звязда» паведамляла чытачам: *«На падрыхтоўчую ступень прымаюцца асобы, якія ўмеюць чытаць, пісаць, знаёмыя з чатырма дзеяннямі арыфметыкі, на ўніверсітэцкія аддзелы рабфака прымаюцца асобы, якія свабодна валодаюць вусным і пісьмовым маўленнем, што маюць агульнае знаёмства з арыфметыкай і асноўнымі паняццямі геаметрыі. Доступ адкрыты для ўсіх рабочых, сялян і чырвонаармейцаў. У першую чаргу прымаюцца асобы фізічнай працы. Слухачы карыстаюцца забеспячэннем і пайком для студэнтаў»*.



Праўленне БДУ. 1920-я гг.

Першыя студэнты БДУ ў 1920–30-х гадах пражывалі ў інтэрнатах, дадзеных універсітэту гарадскімі ўладамі, на вуліцах Камсамольскай, Энгельса, Беларускай і Леніна.

Сапраўды, для студэнтаў была арганізавана выдача штомесячнага пайка: мука, цукар, алей, замарожанае салёнае мяса. А ўжо ў 1922-м годзе студэнты атрымлівалі стыпендыі (акрамя рабфака, але тыя мелі першачарговасць пры засяленні ў інтэрнаты).

НАВУЧАННЕ

ФГН адкрыўся ў складзе аддзялення: этналінгвістычнага з секцыямі рускай, беларускай і яўрэйскай моў, грамадска-педагагічнага, эканамічнага і прававога. На юрыдычным аддзяленні акрамя прававых дысцыплін выкладалі палітэканомію, эканамічную гісторыю, гісторыю народнай гаспадаркі Беларусі і Расіі, дыялектычны матэрыялізм. У канцы 1921 г. створана кафедра пралетарскай рэвалюцыі і марксізму, курс якой чытаўся ўсім студэнтам. Тады ж на педагагічным аддзяленні арганізавалася кафедра заалогіі – на яе базе пазней узнікне біялагічны факультэт.

Першы навучальны план медфака БДУ быў разлічаны на 5 гадоў, ці 13 трыместраў: 6 трыместраў для асноўнага (малодшага) аддзялення і 7 для старэйшага. Тэарэтычныя курсы, напрыклад, гісторыя медыцыны, чыталіся ў мінімальным аб'ёме з-за катастрафічнага недахопу ўрачоў на месцах і неабходнасці рыхтаваць перш за ўсё практыкаў. Адчуваўся дух часу: з прычыны імкнення да належнага палітычнага выхавання моладзі ў навучальным плане медфака на «агульна-адукацыйныя палітычныя прадметы» было вылучана 19 гадзін. Гэта больш, чым на грамадскую медыцыну і гісторыю медыцыны разам. Факультэт складаўся з 7 кафедраў: анатоміі, арганічнай хіміі, батанікі, заалогіі, нервовых хвароб, паталагічнай анатоміі і гісталогіі, фізікі. Для павышэння якасці навучання пры медыцынскім факультэце ўладкавалі анатамічны тэатр, які лічыўся адным з найлепшых сярод савецкіх рэспублік, а яго ёмістасць складала каля 200 чалавек.

Навучальная праграма рабфака на першы навучальны год прадугледжвала ліквідацыю прабелаў за курс класічнай сярэдняй школы разам з ідэалагічным блокам: матэматыка, фізіка, хімія, прыродазнаўства, беларуская мова і літаратура, гісторыя Беларусі, геаграфія, палітычная эканомія, гісторыя рэвалюцыйнага руху, асновы савецкага гаспадарання, гістарычны матэрыялізм. У асобнай яўрэйскай групе вывучалі ідыш, яўрэйскую літаратуру і гісторыю. Слухачы рабфака з моманту залічэння знаходзіліся на ўліку прэзідыума рабочага факультэта. Адлічыцца слухач мог толькі з дазволу прэзідыума і арганізацыі, якая яго дэлегавала.

На рабфаку было і творчае жыццё: у 1921 г. адкрыўся драматычны гурток, які карыстаўся папулярнасцю сярод студэнтаў, дапамагаючы ім далучацца да культуры і мастацтва.



Прафесарска-выкладчыцкі склад. 1920-я гг.



БУДЫНКІ

Немалаважным было афіцыйнае зацвярджэнне спіса будынкаў, якія перахадзілі ў карыстанне БДУ. Сярод іх гімназія Зубакіна і Фальковіча (пазней – Дом №1 БДУ). Тут размяшчалася праўленне БДУ (рэктарат), бібліятэка, рабфак.

ПАЗАНАВУЧАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

Універсітэту перадалі памяшканне Камерцыйнага вучылішча, якое знаходзілася на тэрыторыі сучаснай плошчы Незалежнасці. Некаторы час тут працавала педагагічнае аддзяленне, пазней будынак адышоў Інстытуту народнай гаспадаркі (БДЭУ).

З надыходам халадоў студэнцкія брыгады накіроўваліся ў лясы пад Мінскам па дровы – для апалу навучальных аўдыторый і інтэрнатаў. А ў кааператыве «Медык» на плошчы Свабоды навучэнцам выдавалі харчовыя пайкі.

Паралельна развівалася грамадскае жыццё: 1 студзеня 1922-га ў БНУ адбыўся першы камсамольскі сход. Камсамольская ячэйка аб'яднала каля 40 чалавек.

Важнай вяхой у станаўленні акадэмічнага асяроддзя стала 25 лютага, тады адбыўся арганізацыйны сход навуковага грамадства ўніверсітэта. Утварыліся 4 секцыі: краязнаўства, тэхніка-эканамічная, фізіка-матэматычных і грамадскіх навук. Ужо ў красавіку выйшаў першы выпуск навуковага зборніка БДУ «Працы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».

Алена СВІНКО
Музей гісторыі БДУ

ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКІ СКЛАД

14 прафесараў

49 выкладчыкаў

10 асістэнтаў

3 прэпаратары

5 кіраўнікоў кабінетаў

1390 студэнтаў

РЭКТАР



Калегія Наркамасветы БССР 8 ліпеня 1921 г. афіцыйна прызначыла кіраўніцтва БДУ – праўленне, якое ўзначаліў рэктар, выбітны гісторык Уладзімір Іванавіч Пічэта. Вядомы спецыяліст па гісторыі славянскіх народаў, ён у кароткія тэрміны ператварыў БДУ ў галоўны інтэлектуальны цэнтр савецкай Беларусі.

Першы рэктар узяў на сябе пошукі рашэнняў наяўных праблем. Дзякуючы яго мэтанакіраванасці ВНУ паступова рухалася да дасягненняў.

На III сесіі ЦВК БССР 26 чэрвеня заслухалі справаздачу пра дзейнасць універсітэта – вынікамі 1921/1922 г. былі цалкам здаволены. Старшыня ЦВК Беларусі А. Р. Чарвякоў станоўча ацэньваў працу Пічэты. У тэлеграме з нагоды «дня гадавіны першага акадэмічнага года», дасланай у БДУ, ён паставіў Уладзіміра Іванавіча ў прыклад усім, ахарактарызаваў яго як «цалкам адданага адуказнай і цяжкай справе...» – справе стварэння БДУ, першы год дзейнасці якога «канчаткова замацаваў яго велізарнае эканамічнае, палітычнае і культурнае значэнне для краю».

2026: ГІСТОРЫЯ, ЯКУЮ МЫ СТВАРАЕМ

БДУ сёння – гэта інавацыйны ўніверсітэт з перадавымі тэхналогіямі і метадыкамі навучання, шматтысячная карпарацыя прафесіяналаў, аўтарытэтных навукоўцаў і найлепшых выкладчыкаў.

НАВУЧАННЕ

Сёння адукацыйная карта БДУ значна шырэйшая, чым гэта было 105 гадоў назад. Вядзецца падрыхтоўка па 29 спецыяльнасцях I ступені вышэйшай адукацыі, 82 спецыяльнасцях бакалаўрыята, 10 спецыяльнасцях бесперапынных адукацыйных праграм і 50 спецыяльнасцях магістратуры. За апошнія пяць гадоў адкрыта больш за 20 новых спецыяльнасцяў.

Сучасная праграма ўсё часцей выходзіць за межы адной дысцыпліны. Практычна ўсе новыя спецыяльнасці апошніх гадоў маюць міждысцыплінарны характар.



СУПРАЦОЎНІКІ

За ўніверсітэтам стаіць вялікі калектыў:

звыш 6600 супрацоўнікаў налічваецца ў ВНУ

больш за 2800 выкладчыкаў

працуюць 5 акадэмікаў

больш за 1300 кандыдатаў навук

каля 300 супрацоўнікаў маюць навуковую ступень доктара навук

6 членаў-карэспандэнтаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі



Адукацыя злучаецца з даследчай і праектнай працай, а падрыхтоўка спецыялістаў – з рэальнымі прафесійнымі задачамі.

Сёння сучасныя заняткі могуць існаваць адначасова ў некалькіх прасторах: у аўдыторыі, лабараторыі, на лічбавай пляцоўцы, у праектнай групе. Адукацыйны партал БДУ ўключае ў сябе каля 19 900 электронных пляцовак навучальных дысцыплін. У лічбавым асяроддзі размяшчаюцца матэрыялы курсаў і заданні, а адукацыйны працэс усё больш прадугледжвае самастойную працу студэнта, праектную дзейнасць і ўзаемадзеянне з выкладчыкам за межамі звычайнай пары.

Пры гэтым лекцыя як форма навучання не знікла. Змяніўся кантэкст вакол яе: да традыцыйнага тлумачэння матэрыялу дадаліся лічбавыя інструменты, практычныя задачы, даследчая праца і магчымасць звярнацца да навучальных матэрыялаў анлайн.

НАВУКА

Навука стала арганічнай часткай універсітэцкага жыцця. Тут працуюць 57 навуковых школ і 88 навукова-даследчых лабараторый, а студэнты і магістранты могуць удзельнічаць у даследаваннях у 66 студэнцкіх навукова-даследчых лабараторыях і 135 навуковых гуртках.



Даследаванні БДУ ахопліваюць розныя галіны – ад касмічных тэхналогій да медыцыны, біялогіі і штучнага інтэлекту. Універсітэт распрацоўвае нанаспадарожнікі і абсталяванне для навуковых эксперыментаў на Міжнароднай касмічнай станцыі.

Важны кірунак – медыцынскія распрацоўкі: тэхналогіі навукоўцаў БДУ выкарыстоўваюцца для вытворчасці супрацьпухлінных прэпаратаў «Цысплацэл» і «Тэмадэкс». Таксама ўніверсітэцкія даследаванні дапамагаюць ствараць біяпрэпараты для ветэрынарыі і абароны раслін.

Навуковая дзейнасць не абмяжоўваецца лабараторыямі. БДУ развівае супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі, у тым ліку з Пекінскім універсітэтам, разам з якім у 2025 годзе быў адкрыты Беларуска-кітайскі цэнтр фундаментальных навуковых даследаванняў. Такім чынам, універсітэт аб'ядноўвае фундаментальную навуку, практычныя распрацоўкі і падрыхтоўку новага пакалення даследчыкаў.

СТУДЭНТЫ

Сёння маштаб студэнцкай аўдыторыі змяніўся.

У КОМПЛЕКСЕ БДУ НАВУЧАЕЦЦА 25 957 СТУДЭНТАЎ, МАГІСТРАНТАЎ, АСПІРАНТАЎ І ДАКТАРАНТАЎ.

5823 з іх – замежныя грамадзяне. За гэтымі лічбамі зусім розны досвед. Для адных ВНУ адкрывае новае самастойнае жыццё, для іншых – становіцца працягам абранай кар'еры. Геаграфія студэнцкай супольнасці БДУ імкліва пашыраецца. Сёння ўніверсітэт актыўна супрацоўнічае з партнёрамі больш чым з 60 краін, дзякуючы чаму міжнародныя кантакты сталі ў ВНУ штодзённымі.

БУДЫНКІ

Сёння Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб'ядноўвае 20 спецыялізаваных будынкаў для адукацыйнай і выхаваўчай дзейнасці, 3 будынкі фізкультурна-аздараўленчага і спартыўнага прызначэння і 6 адміністрацыйна-гаспадарчых карпусоў.

Асобная частка прасторы – студэнцкі гарадок. Сёння ў кампусе 10 інтэрнатаў: 9 прызначаны для студэнтаў, яшчэ адзін – для работнікаў. У іх ёсць пакоі для заняткаў і адпачынку, трэнажорныя і спартыўныя залы, клубы па інтарэсах і іншыя месцы для зносін.

Універсітэт працягвае паляпшаць і нарошчваць матэрыяльна-тэхнічную базу. Уведзены ў эксплуатацыю фізкультурна-аздараўленчы комплекс. На біялагічным факультэце пачала працу лабараторыя структурнай і функцыянальнай біялогіі бялку, працягваецца будаўніцтва лабараторнага корпуса. У Ліцэі імя Ф. Э. Дзяржынскага БДУ адкрылі біялагічную навучальную лабараторыю, а на факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій – навучальна-навуковую лабараторыю па кібербяспецы. Ідзе капітальны рамонт галоўнага корпуса.



Галоўны корпус БДУ

ПАЗАНАВУЧАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

Самастойнае студэнцкае жыццё праз 105 гадоў стала больш разнастайным,



але яго аснова засталася ранейшай – студэнту патрэбны не толькі падручнік, але і ўмовы для развіцця ўласных інтарэсаў.

Сёння ў БДУ дзейнічаюць 120 клубных фарміраванняў і 9 творчых калектываў. Штогод праводзіцца больш за 500 культурна-масавых мерапрыемстваў. Тут можна займацца творчасцю, спортам, валанцёрствам, навукай ці студэнцкім самакіраваннем.

Працуюць 57 груп спартыўнага ўдасканалення па 27 відах спорту. Добраахвотніцкая дзейнасць аб'ядноўвае 11 атрадаў, якія працуюць у спартыўным, культурным, экалагічным, сацыяльным і іншых напрамках. Студэнцкае самакіраванне аб'ядноўвае савет старастаў, студэнцкае навуковае грамадства, савет інтэрнатаў і савет зямляцтваў.

Ксенія СМІРНОВА

ІНФРАСТРУКТУРА БДУ

16 факультэтаў

3 інстытуты

7 устаноў адукацыі

172 кафедры

88 навукова-даследчых лабараторый

6 навукова-даследчых інстытутаў і цэнтраў

7 прадпрыемстваў, навукова-тэхналагічны парк

3 навучальна-доследныя станцыі

4 музеі

УНІВЕРСІТЭТ 20 кастрычніка 2026 года, №10 (2314) БДУ 105 | 5

105 ГАДОЎ ПЕРШЫНСТВА БДУ

Рубрыка «105 гадоў першынства», якую падрыхтавала прэс-служба БДУ, на сайце ўніверсітэта – гэта падбор унікальных фактаў і падзей з жыцця найстарэйшай установы вышэйшай адукацыі Беларусі, пацвярджэнне яе лідарства і выключнасці па розных напрамках. Асноўны акцэнт зроблены на канцэпцыі «Першы. Адзіны. Лідар». Выпускі рубрыкі паказалі ўнікальныя для нашай краіны спецыяльнасці, навуковыя распрацоўкі, якія не маюць айчынных і сусветных аналагаў, поспехі студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ ў прэстыжных інтэлектуальных змаганнях. Публікуем вытрымкі з рубрыкі і эксклюзіўнага выдання – фотаальбома «БДУ: быць першым заўсёды» – гісторыя, дасягненні і ключавыя падзеі 105-гадовага шляху БДУ, якія паўплывалі на станаўленне і сучаснасць айчыннай адукацыі і навукі.


ДЕКРЕТ

Центрального Исполнительного Комитета Рабочих, Крестьянских и Солдатских Депутатов С. С. Р. Белоруссии.

от 25 февраля 1919 года.

Центральный Исполнительный Комитет Советов Рабочих, Солдатских и Крестьянских Депутатов С. С .Р. Белоруссии постановил:

Открыть в гор. Минске Государственный У-т и на первые и на личные нужды по его организации отпустить из средств Республики один миллион руб. (1.000.000р.).

Председатель Ц. И. К. Белоруссии М я с н и к о в.





ПЕРШЫ

- З БДУ пачынаецца гісторыя вышэйшай адукацыі, універсітэцкай сістэмы і навукі ў Беларусі. Адным з першых рашэнняў БССР стала падпісанне 25 лютага 1919 года Дэкрэта аб адкрыцці ў Мінску дзяржаўнага ўніверсітэта.
- БДУ з'яўляецца заснавальнікам 12 сучасных вышэйшых і навуковых устаноў.
- Навукоўцы БДУ ўнеслі важкі інтэлектуальны і арганізацыйны ўклад у стварэнне Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Першым яе кіраўніком стаў дэкан факультэта грамадскіх навук БДУ Усевалад Ігнатоўскі.
- Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў 1926 годзе была створана на базе ўніверсітэцкай бібліятэкі БДУ, якая перадала практычна ўвесь свой фонд колькасцю звыш 200 тыс. экземпляраў.
- Першая ў краіне аспірантура і класічная навуковая школа створана ў 20–30-х гадах мінулага стагоддзя ў БДУ. Яе заснавальнікам быў першы рэктар БДУ Уладзімір Пічэта.
- У 1971 годзе ва ўніверсітэце адкрыўся першы ў БССР навуковы інстытут – НДІ прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі.
- Навуковыя адкрыцці сусветнага ўзроўню ў галіне ядзернай фізікі зрабіў у 1979 і 1988 гадах навуковец БДУ Уладзімір Барышэўскі.
- У 1961 годзе ўніверсітэт першы ў БССР і ў ліку чатырох універсітэтаў СССР прыняў на навучанне замежнікаў з Кубы, Манголіі і В'етнама.
- У БДУ вучыцца 30% замежнікаў ад агульнай колькасці па Беларусі. Гэта каля 5,8 тысяч студэнтаў з 51 краіны.
- БДУ першым у краіне пачаў навучанне на англійскай мове і сёння лідзіруе па гэтым параметры.
- БДУ чатыры разы станавіўся «Найлепшым экспарцёрам года»: у 2020, 2021, 2023 і 2024 гадах.
- БДУ першы ў Беларусі ўкараніў практыку двайных дыпломаў. Сёння ўніверсітэт рэалізуе 26 сумесных адукацыйных праграм, шэсць з якіх – з выдачай двух дыпломаў.
- На БДУ даводзіцца каля 20% цытаванняў прац беларускіх навукоўцаў сярод усіх навуковых і адукацыйных арганізацый Беларусі.

АДЗІНЫ

- БДУ да 1969 года адзіны ў краіне меў статус «універсітэт».
- Выкладчыкі БДУ ўдзельнічалі ў 1945 годзе ў падпісанні Статута ААН.
- У БДУ ўкаранёная інавацыйная сістэма эўрыстычнага навучання, якая дазваляе індывідуалізаваць адукацыйную траекторыю навучэнца, а навучальную камунікацыю зрабіць дыялагічнай.
- Калектыў НДІ ядзерных праблем БДУ адзіны ў СНД увайшоў у найбуйнейшы еўрапейскі мегапраект GRAPHENE FLAGSHIP («Флагман графен»).
- Студэнты ФПМІ БДУ адзіныя з ліку беларусаў за ўсю гісторыю ўдзелу ў чэмпіянаце свету па праграмаванні сярод студэнтаў (ICPC) заваявалі залаты медаль (2004), «бронзу» (2008) і тры «сярэбраныя» ўзнагароды (2012, 2013, 2021).
- БДУ адзіны ў краіне з 1998 года з'яўляецца ўладальнікам сертыфіката ўніверсітэта – арганізатара рэгіянальных адборачных чвэрцьфінальных спаборніцтваў ICPC.
- Званняў «Найлепшы інстытут Канфуцыя года» і «Узорны інстытут Канфуцыя» ўдастоены ў Беларусі толькі Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ. Ён адзіны ў краіне праводзіць міжнародны экзамен па кітайскай мове CATTI.
- БДУ з'яўляецца адзіным універсітэтам у краіне, які стварыў уласныя касмічныя нанаспадарожнікі, паспяхова выведзеныя на арбіту ў 2018 і 2023 гадах.
- Беларускі касманаўт Марына Васілеўская правяла на МКС трохузроўневы навуковы эксперымент, падрыхтаваны выключна навукоўцамі БДУ.
- БДУ распрацаваў і выпускае ўнікальныя супрацьпухлінныя прэпараты для лакальнай хіміятэрапіі «Цыслацэл» і «Тэмадэкс», апошні з якіх запатэнтаваны ў 56 краінах, уключаючы ЗША, Канаду, Японію, Індыю, Бразілію, Мексіку і Аўстралію.
- Часопісы БДУ па гісторыі, а таксама па матэматыцы і інфарматыцы ўключаны ў навукаметрычную рэфератыўную базу даных Scopus.
- «Часопіс БДУ. Гісторыя» адзіны з беларускай навуковай перыёдыкі ўвайшоў у эліту сусветных профільных выданняў і атрымаў найвышэйшую ацэнку Q1 паводле SCImago Journal Rank. Гэта прыраўноўвае яго да ўваходжання ў 25% найбольш цытаванай навуковай літаратуры ў свеце.

ЛІДАР

- За 105-гадовы перыяд у БДУ падрыхтавана больш за 200 000 спецыялістаў, звыш 4900 кандыдатаў навук, больш за 750 дактароў навук, звыш 24 000 замежных спецыялістаў, магістрантаў, аспірантаў.
- 10 з 19 народных паэтаў і пісьменнікаў Беларусі вучыліся, працавалі ці былі ўдастоены звання «Ганаровы доктар БДУ». Сярод іх Якуб Колас, Кандрат Крапіва, Пятрусь Броўка, Іван Мележ, Іван Навуменка, Ніл Гілевіч, Рыгор Барадулін, Іван Чыгрынаў, Уладзімір Карызна, Мікалай Чаргінец.
- 11 супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза за мужнасць і адвагу ў барацьбе з фашыстамі ў гады ВАВ. Да вайны гэтага высокага звання быў двойчы ўдастоены выпускнік БДУ, выбітны авіятар Якаў Уладзіміравіч Смушкевіч, які ўнёс уклад у развіццё савецкай баявой авіяцыі ў 1930-я гады.
- БДУ – галоўная пляцоўка па падрыхтоўцы нацыянальных школьных зборных да алімпіяд сусветнага ўзроўню. Пад кіраўніцтвам выкладчыкаў школьнікі штогод заваёўваюць вышэйшыя ўзнагароды па хіміі, геаграфіі, біялогіі, матэматыцы, фізіцы.
- Унікальным стала выданне дапаможніка для ўсіх беларускіх універсітэтаў «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» і «Атласа беларускай дзяржаўнасці».
- Студэнты БДУ заваявалі другое месца сярод 135 каманд на прэстыжнай 33-й Міжнароднай матэматычнай алімпіядзе (IMC–2026). Гэта найлепшы вынік за больш чым 25-гадовую гісторыю ўдзелу Беларусі ў алімпіядзе.
- Навукоўцы БДУ ўвайшлі ў склад рэдкалегіі па перавыданні Нацыянальнага атласа Беларусі.
- Супрацоўнікі ўніверсітэта ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы абноўленай рэдакцыі Канстытуцыі Беларусі, змены ў якой былі прыняты на рэспубліканскім рэферэндуме ў 2022 годзе.
- БДУ адкрыў Інстытут інавацыйнай адукацыі ў г. Санья (КНР).
- Сумесна з Пекінскім універсітэтам БДУ адкрыў Беларуска-кітайскі цэнтр фундаментальных навуковых даследаванняў.
- У БДУ дзейнічае адзіная і ўнікальная для нашай краіны лабараторыя структурнай і функцыянальнай біялогіі бялку.

- Кожны 3-і таленавіты малады навуковец і кожны 4-ы аспірант сістэмы Міністэрства адукацыі, удастоеныя стыпендыі Прэзідэнта Беларусі, працуе і навучаецца ў БДУ.
- Кожны 2-і кітайскі аспірант у краіне навучаецца ў БДУ.
- Кожная 3-я доктарская і 4-я кандыдацкая дысертацыі абараняюцца работнікамі ўніверсітэта.
- БДУ – уладальнік прэміі ўрада Беларусі ў галіне якасці 2024 года.
- БДУ прысвоены статус «Лідар штучнага інтэлекту Беларусі» на міжнародным форуме IT-Акадэмграда НАН Беларусі.
- Электронная бібліятэка БДУ ўваходзіць у тройку найлепшых універсітэцкіх рэпазітарыяў у свеце паводле міжнароднага рэйтынгу Transparent Ranking of Repositories.
- БРСМ БДУ і пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў з'яўляюцца самымі шматлікімі пярвічнымі арганізацыямі сярод ВНУ ў Беларусі.
- БДУ ўваходзіць у сеткавы Універсітэт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва і выступае тут Нацыянальным рэктаратам беларускіх універсітэтаў.
- На рахунку БДУ каля 650 падпісаных пагадненняў з адукацыйнымі і навуковымі ўстановамі, міжнароднымі кампаніямі і арганізацыямі з 59 краін.
- Важнымі стратэгічнымі партнёрамі БДУ выступаюць Расія і Кітай, на долю якіх даводзіцца 30% і 20% адпаведна ўсіх дзеючых у БДУ міжнародных пагадненняў.
- БДУ заснаваў з ВНУ-партнёрамі ўнікальныя міжуніверсітэцкія святы «Дні сяброўства БДУ і МДУ імя М. В. Ламаносава» і «Дні сяброўства і адзінства БДУ і Пекінскага ўніверсітэта».
- БДУ адзіны з усіх беларускіх універсітэтаў уваходзіць у 2% найлепшых ВНУ ў свеце і прадстаўлены ў аўтарытэтных сусветных рэйтынгах – THE, QS і Маскоўскім міжнародным рэйтынгу «Тры місіі ўніверсітэта» (MosIUR).
- Універсітэт у рэйтынгу БРІКС займае 36-ю пазіцыю з 750 магчымых.
- БДУ адзіны з беларускіх ВНУ ўваходзіць у топ-25 надзейных партнёраў Міністэрства адукацыі Кітая.
- За апошнія пяць гадоў універсітэт укараніў 25 новых праграм, з іх 23 – унікальныя ў краіне.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ



















СВЕДКІ ЭПОХІ. ЯК МЯНЯЎСЯ ЎНІВЕРСІТЭТ:

Старэйшыя супрацоўнікі розных факультэтаў расказалі пра тое, якой альма-матар была раней і як развівалася з цягам часу. Калісьці яны прыйшлі сюды студэнтамі і засталіся тут больш чым на паўстагоддзя. Іх шматгадовая праца адзначана высокімі ўзнагародамі. Сёння яны па-ранейшаму выконваюць свае абавязкі, вядуць заняткі, выхоўваюць моладзь і прызнаюцца: для іх БДУ не проста месца працы.



70 гадоў з БДУ

Ігар Яўгенавіч Шымановіч

Сёлета **Ігар Яўгенавіч Шымановіч** адзначыў 70-годдзе знаходжання ў БДУ. Прафесар працуе на кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі хімічнага факультэта, выпускніком якога стаў 65 гадоў таму. Добра памятае, як у 1969 годзе хімфак пераехаў у новы будынак на Ленінградскай, а да гэтага студэнты вучыліся ў цяперашнім будынку Інстытута ядзерных праблем БДУ.

– Ужо на другім курсе я актыўна ўдзельнічаў у працы радыехімічнай лабараторыі, якой кіраваў акадэмік М. М. Паўлючэнка, – успамінае прафесар. *– Але практычна маім станаўленнем у навуцы займаўся І. І. Пакроўскі, які быў усяго на тры гады старэйшы за мяне. Праз два гады аспірантуры я быў залічаны ў штат лабараторыі. У 1970 годзе дэкан хімфака Ф. М. Капуцкі прапанаваў мне перайсці на педагагічную працу спачатку на кафедру неарганічнай хіміі, а ў 1975 годзе на толькі што створаную кафедру агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, дзе я да гэтага часу працую.*

У 1977 годзе І. Я. Шымановіч быў накіраваны Міністэрствам адукацыі СССР у Мазамбік, на поўдзень Афрыкі. Там ён выкладаў агульную і неарганічную хімію на партугальскай мове ў мясцовым універсітэце, а два апошнія гады быў адначасова і намеснікам дэкана хімічнага факультэта. Менавіта ў Мазамбіку ў суаўтарстве ён напісаў свой першы падручнік для ліцэістаў гэтай краіны.

Калі вярнуўся на радзіму, каб не губляць ведання партугальскай мовы, па прапанове выдавецтва «МІР» Ігар Яўгенавіч пераклаў з рускай на партугальскую 700-старонкавы падручнік «Агульная хімія» М. Л. Глінкі. Гэты пераклад праз некалькі гадоў вытрымаў другое выданне.

У 1984 годзе выйшла ў суаўтарстве кніга «Агульная хімія ў формулах, вызначэннях, схемах». Нечакана для яго яна стала папулярнай, пазней выйшла другое выданне, а затым пераклад на англійскую і арабскую мовы.

– У 1990-я, калі кантроль з боку былога СССР аслабеў, універсітэцкія выдавецтвы ў Індыі сталі яе тыражаваць. Спыніць гэты працэс было немагчыма, – усміхаецца прафесар.

У сярэдзіне 1990-х гг. Міністэрства адукацыі Беларусі прапанавала Ігару Шымановічу заняцца стварэннем нацыянальнай лінейкі школьных падручнікаў па хіміі. Узначаліўшы групу па распрацоўцы навучальнага і метадычнага забеспячэння хімічнай адукацыі ў Беларусі, ён фактычна стварыў сучасную айчынную школу выкладання прадмета. Сёння яго імя як аўтара і рэдактара ўпрыгожвае звыш 140 падручнікаў і дапаможнікаў.

– Ганаруся тым, што ўдзельнічаю ў падрыхтоўцы школьных і ўніверсітэцкіх падручнікаў больш за 30 гадоў, – падкрэслівае ён.

І. Я. Шымановіч паспяхова сумяшчае інтарэсы ў галіне педагогікі з навуковай і грамадскай дзейнасцю. Ім надрукавана каля 150 навуковых прац па розных кірунках хіміі. Ён задзейнічаны ў выкананні навуковых тэм па замовах прадпрыемстваў і навуковых арганізацый. Прафесар сфарміраваў важны навуковы напрамак па прымяненні хімічных метадаў для стварэння і мадыфікацыі порыстых матэрыялаў на металічнай і керамічнай аснове. Ён увёў у адукацыйны працэс шэраг новых інфармацыйных тэхналогій і прагрэсіўных метадаў навучання, у прыватнасці, блокава-модульны прынцып заняткаў па агульнай і неарганічнай хіміі з адпаведным навучальна-метадычным забеспячэннем.

Яго сакрэт прафесійнага даўгалецця такі:

– Для мяне навука і выкладанне – гэта не проста праца, а тое, што робіць жыццё па-сапраўднаму напоўненым. Гэта дзейнасць дазваляе злучаць тэорыю з практыкай, назіраць, як з учарашніх першакурснікаў вырастаюць навукоўцы. Калі ты шчыра любіш сваю справу, ты не падуладны часу.



68 гадоў з БДУ

Анатоль Барысавіч Антаневіч

Змены ў альма-матар адбываліся на вачах **Анатоля Барысавіча Антаневіча**, доктара фізіка-матэматычных навук. Паступіў на фізіка-матэматычны факультэт БДУ ў 1958 годзе (у кастрычніку ён падзяліўся на два асобныя), скончыў матэматычны ў 1963-м, а сёння працуе прафесарам кафедры інтэлектуальных метадаў мадэлявання на механіка-матэматычным.

– Я памятаю, як два факультэты размяшчаліся ў цяперашнім будынку рэктарата, – дзеліцца ён. *– Месца было няшмат, і два дэканы, Д. А. Супруненка і М. П. Халімановіч, сядзелі ў адным кабінеце. Факультэт рос імкліва. Нават калі ў 1961-м мы пераехалі ў галоўны корпус, у адным пакоі з нашай кафедрай мясціліся яшчэ тры, але гэта не перашкаджала эфектыўнай працы.*

Чалавекам, які адкрыў перад ім дзверы ў матэматыку, Антаневіч называе дацэнта А. М. Родава – кіраўніка яго дыпломнай працы. Ён умеў выклікаць у студэнтаў шчырую цікавасць да матэматычных тонкасцяў і аказаў вялікі ўплыў на ўзровень развіцця матэматыкі ў БДУ. Цяпер Антаневіч сам ужо шмат гадоў чытае лекцыі. Вынікі студэнтаў, якія паспяхова засвойваюць матэрыял, натхняюць. Лічыць, што адораных студэнтаў, якія могуць і хочуць займацца матэматыкай, з часам не стала менш.

Эвалюцыя працоўнага месца таксама была хуткай. Калісьці актуальным абсталяваннем былі электрычныя арыфмометры «Рэйнметал», затым ЭВМ, а потым персанальныя камп'ютары. Спачатку апошніх было мала, і супрацоўнікі жартавалі: «Як яны могуць быць персанальнымі, калі ўсе яны калектыўныя?»

– Цяпер я ўжо не магу адказаць, колькі на факультэце вылічальнай тэхнікі. Але мне матэматыка падабаецца тым, што поспехі ў ёй у першую чаргу залежаць ад здольнасцяў і ўзроўню падрыхтоўкі, а не ад абсталявання, – кажа ён.

Першыя навуковыя працы Антаневіча, якія прынеслі вядомасць, былі звязаны з праблемай індэкса нелакальных аператараў. У 1969 годзе ён атрымаў формулу, якая выражае індэкс нелакальнага псеўдадыферэнцыяльнага аператара праз тапалагічныя інварыянты – лікі Лефшэца. Гэта была першая праца ў СССР, дзе выкарыстоўвалася так званая К-тэорыя, якая атрымала шырокі рэзананс і незадоўга да гэтага была пабудавана матэматыкам М. Ацьёй.

Сфера навуковых інтарэсаў прафесара – тэорыя функцыянальных аператараў і аператарных алгебраў, множанне абагульненых функцый. Ён аўтар больш чым 200 навуковых і метадычных прац, у тым ліку 5 манаграфій, выдадзеных на англійскай мове. Сумесна з Я. В. Радынам і П. М. Князевым яшчэ ў 1978 годзе напісаў першы ў СССР зборнік задач па функцыянальным аналізе, які перавыдаваўся 4 разы і быў перакладзены на іспанскую мову.

Матэматыка была не адзіным захапленнем Анатоля Барысавіча. Ён майстар спорту СССР па грэка-рымскай барацьбе, быў чэмпіёнам рэспублікі і пераможцам моладзевага чэмпіянату СССР. А яшчэ яму пакараліся складаныя маршруты ў гарах.

– Ляжаць на пляжы – не для мяне. Рэгулярна ездзіў у горы: Каўказ, Памір, Цянь-Шань, Алтай, Саяны, Камчатка... За гэта атрымаў званне майстра спорту СССР па горным турызме.

А. Б. Антаневіч усё жыццё прысвяціў мехмату, і тое, што адбываецца на родным факультэце, яму шчыра неабыякава. Ён падрыхтаваў 30 кандыдатаў навук і сёння бачыць сваю галоўную задачу ў падтрымцы новага пакалення навукоўцаў:

– Нягледзячы на тое, што зараз я мог бы пайсці на заслужаны адпачынак, мяне ўтрымлівае на працы імкненне дапамагчы калегам. На нашай кафедры супрацоўнікі ў асноўным дзеляцца на дзве катэгорыі: старэйшыя за 60 гадоў, якія маюць навуковую ступень, і моладзь да 30. Мая мэта – дапамагчы пераадолець гэты разрыў пакаленняў. Зараз я курырую 8 маладых супрацоўнікаў, якія пішуць дысертацыі. Трэба падтрымаць іх, перадаць вопыт, каб сфарміраваць кадравы рэзерв. Менавіта ў такой пераемнасці я бачу галоўны стымул працягваць працу.



64 гады працуе ў БДУ

Эльвіра Аляксандраўна Аўданіна

Эльвіра Аляксандраўна Аўданіна сёння працуе вядучым інжынерам на кафедры ядзернай фізікі фізічнага факультэта. Пачатак яе шляху ў БДУ супаў з перыядам бурнага развіцця навукі. Тады краіна здзейсніла фундаментальны прарыў у атамнай энергетыцы, ядзернай фізіцы і асваенні космасу. Перад навуковай супольнасцю паўстала задача дэцэнтралізацыі атамных даследаванняў. Было прынята рашэнне ўзмацніць навуковую базу атамнага праекта ў саюзных рэспубліках.

Так, у сакавіку 1961 года кіраўніцтва БДУ запрасіла А. М. Пісарэўскага, навукоўца з Радыевага інстытута Акадэміі навук СССР, для стварэння кафедры ядзернай фізікі. Яго кар'ера была цесна звязана з савецкім атамным праектам, а сам інстытут у той час шмат у чым вызначаў навукова-тэхнічны прагрэс атамнай індустрыі.

– Я пачала працаваць на кафедры ядзернай фізікі з 1962 года – практычна з першых гадоў яе стварэння. Мая дыпломная праца была прысвечана распрацоўцы і стварэнню спектрометра хуткіх нейтронаў з дыскрымінацыяй гамакампаненты. Эксперыментальныя выпрабаванні спектрометра паспяхова прайшлі ў нейтроннай лабараторыі кафедры. Пасля абароны дыплома загадчык кафедры Пісарэўскі запрасіў мяне на пасаду інжынера. Пад кіраўніцтвам А. М. Люцко (пасля – заснавальнік і першы рэктар МДЭІ імя А. Д. Сахарава) я займалася пытаннямі дазіметрыі і абароны ад выпраменьвання. Праз некаторы час мне прапанавалі пасаду загадчыцы навучальных лабараторый па ядзернай фізіцы, спектраметрыі, радыяметрыі і дазіметрыі. Створаныя агульныя і спецпрактыкумы на базе перадавога для таго часу абсталявання дазвалялі рыхтаваць спецыялістаў высокага ўзроўню. Мая праца была звязана з наладжваннем і забеспячэннем навучальнага працэсу ў лабараторыях, з арганізацыяй рамонту і набыццём абсталявання.

Гэта быў час грамадскай рамантызацыі фізічнай навукі. І маладая кафедра ядзернай фізікі арганічна ўпісалася ў легендарны па навуковых даследаваннях і дасягненнях час. Загадчык кафедры Пісарэўскі дзякуючы крэатыўнаму мысленню здолеў стварыць у маладым калектыве атмасферу творчасці і захопленасці.

– Усе мы ганарыліся тым, што працавалі на кафедры ядзернай фізікі фізічнага факультэта.

У навучальных лабараторыях, якімі я кіравала, сістэматычна распрацоўваліся і ўкараняліся ў навучальны працэс новыя лабараторныя работы, таму іх статус на факультэце лічыўся ўзорна-паказальным. За сваю працу я і мае лабараторыі не раз былі ўзнагароджаны граматамі дэканата, рэктарата і Міністэрства адукацыі. У крызісны перыяд пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС лабараторыя дапамагала краіне мінімізаваць наступствы катастрофы.

Шмат часу Э. А. Аўданінай даводзілася надаваць тэхнічнай мадэрнізацыі, якая цалкам залежала ад узроўню айчыннага прамысловага абсталявання. Гэта вызначала не толькі магчымасці і дакладнасць эксперыментаў, але і знешні выгляд лабараторый. У 60-х гадах спектраметрычная навучальная ўстаноўка ўяўляла сабой велічэзную стойку, запоўненую прыборамі. Але ўжо ў 70-х гадах паўправадніковая рэвалюцыя значна паменшыла габарыты абсталявання.

– У 2001 годзе калектыў кафедры пад кіраўніцтвам таленавітага навукоўца прафесара В. Я. Ямнага распрацаваў для лабараторыі навучальны спектраметрычны комплекс. Падключаны непасрэдна да ЭВМ, ён дазваляў студэнтам усебакова вывучаць уласцівасці ядзернага выпраменьвання. Комплекс быў выкананы на мікрасхемах і адрозніваўся кампактнасцю (памерам прыкладна з кнігу). Сёння лабараторыя, якой я кіравала ўсе гады, застаецца самай сучаснай па ўзроўні абсталявання і разнастайнасці практычных заняткаў. Яна актыўна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы спецыялістаў для Беларускай АЭС.

Э. А. Аўданіна з'яўляецца сааўтарам 5 навучальных дапаможнікаў, якія змяшчаюць апісанне лабараторных практыкумаў.

Вось ужо 37 гадоў **Уладзімір Сяргеевіч Кошалеў** узначальвае кафедру гісторыі новага і найноўшага часу гістарычнага факультэта. Доктар гістарычных навук, аўтар звыш 200 навуковых і навукова-метадычных работ. Яго шлях у БДУ пачаўся ў 1963 годзе з паступлення на гістарычны факультэт.

– Сярод выпускнікоў школы, якія не мелі двухгадовага працоўнага стажу, конкурс дасягаў 15 чалавек на месца, – успамінае ён. *– Усе 4 экзамены я здаў на «выдатна», і гэта стала вырашальным. Добра памятаю паштоўку ад універсітэта: «Залічаны на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта». З яе адкрылася вялікая частка майго жыцця.*

Першымі настаўнікамі ён называе бацькоў. Тата прайшоў дзве вайны: савецка-фінскую і Вялікую Айчынную. Яго франтавы шлях пачаўся ў 1939 г. і завяршыўся ўзяццем Берліна. Лёс бацькі выхаваў у ім павагу да стойкасці, абавязку і памяці пра людзей, на чыю долю выпалі цяжкія выпрабаванні. Матуля навучыла чытаць яшчэ да школы. Дзякуючы маме кніга з ранніх гадоў стала для яго сябрам, а веды – натуральнай часткай жыцця.

– Час ідзе, а блізкасць бацькоў па-ранейшаму адчуваецца побач – у памяці, у паўсядзённых учынках, у словах, якія прыходзяць на розум у важныя хвіліны, – дзеліцца ён. *– Іх жыццёвы вопыт і ўрокі застаюцца для мяне ўнутранай апорай. З удзячнасцю думаю пра школьных настаўнікаў і ўніверсітэцкіх выкладчыкаў. Яны адкрылі мне свет гісторыі, навучылі строгаму стаўленню да крыніц і адказнасці за кожнае слова ў навуковым тэксце. Асаблівае месца ў маім лёсе займаюць прафесары М. П. Палеціка, Л. М. Шнеерсон, кола ўсходазнаўцаў-арабістаў і мой навуковы кіраўнік прафесар Р. Р. Ланда. Іх эрудыцыя, шырокі погляд і ўвага да вучняў задалі высокую прафесійную планку.*

З асаблівай цеплынёй узгадвае студэнцкія атрады 1964 і 1965 гадоў ва Уральскай вобласці. Праца, сяброўства, песні, доўгія размовы – усё гэта паўплывала на яго станаўленне, пачуццё адказнасці і ўзаемадапамогу.



63 гады з БДУ

Уладзімір Сяргеевіч Кошалеў

– Савецкі час падарыў універсітэту атмасферу таварыства, захопленасці агульнай справай. Сённяшнія студэнты хутчэй знаходзяць інфармацыю, свабодна валодаюць тэхналогіямі, шырэй глядзяць на свет. Пры гэтым захоўваецца галоўнае: дапытлівасць, сур'ёзнае стаўленне да прафесіі, павага да фактаў і гатоўнасць самастойна шукаць адказы на складаныя пытанні гісторыі і сучаснасці, – вылучае Уладзімір Сяргеевіч.

Загадчык кафедры ўпэўнены: галоўнае багацце БДУ – людзі. Найбольш каштоўным для яго з'яўляецца стварэнне і падтрыманне навуковай школы. За гады працы яго вучні абаранілі больш за 50 кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Падкрэслівае:

– Кожны з іх прынёс у навуку свой характар, тэму і погляд. У іх працах прасочваецца сувязь пакаленняў, працягваецца і развіваецца навуковая традыцыя, якую мы стваралі разам.

Велізарную ролю ў яго лёсе адыграла вывучэнне арабскай мовы: спачатку ў Інстытуце ўсходніх моў пры МДУ, затым у Каірскім універсітэце ў 1971–1972 гадах.

– Арабская мова адкрыла мне шлях да іншай культуры, спрыяла аб'ёмнаму і сістэмнаму погляду на гісторыю, – робіць акцэнт У. С. Кошалеў.

Паводле яго слоў, сакрэт шматгадовай прафесійнай адданасці і творчага даўгалецця крыецца ў даволі простых, але фундаментальных рэчах:

– Цікавасць да людзей і часу падтрымлівае ўнутраную энергію, прагу да жыцця і імкненне хоць бы трохі наблізіцца да спасціжэння двух-трох вечных пытанняў. Універсітэт кожны год дае магчымасць зноў адчуць сябе вучнем: прыходзяць новыя студэнты, з'яўляюцца новыя пытанні, адкрываюцца розныя магчымасці. БДУ для мяне – прастора, дзе традыцыя сустракаецца з пошукам, маладосць – з вопытам, а веды ператвараюцца ў адказнасць перад краінай і будучымі пакаленнямі.

Сёлета **Уладзімір Станіслававіч Масцяніца** адзначыў 80-годдзе, ужо 62 гады яго лёс звязаны з БДУ. Дацэнт кафедры аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі эканамічнага факультэта, кандыдат фізіка-матэматычных навук, аўтар больш чым 60 навуковых і навукова-метадычных работ. Вышэйшую адукацыю атрымаў на матэматычным факультэце БДУ. Пра сваё паступленне кажа так:



62 гады звязаны з БДУ

Уладзімір Станіслававіч Масцяніца

– Калі заканчваў школу, убачыў у газеце «Знамя юности» ўмовы Другой рэспубліканскай матэматычнай алімпіяды школьнікаў Беларусі, якую праводзілі матэматычны і фізічны факультэты БДУ. Я стаў пераможцам – праўда, пераможцаў было каля 200 чалавек. На ўступных іспытах за гэта балы не налічваліся, але ўвагу на вусным экзамене атрымаў. Я часта ўспамінаю лекцыі Ю. С. Багданава і заняткі А. Ф. Навумовіча, якія ўмелі тлумачыць складаныя рэчы простымі словамі. А зараз я сам чытаю вышэйшую матэматыку.

Уладзімір Станіслававіч палюбіў матэматыку яшчэ ў школе. Прыкладам для яго была старэйшая сястра, якая добра вучылася, і ён стараўся не адставаць ад яе. Строгія, але выдатныя школьныя настаўнікі першымі паказалі, што выкладанне – гэта жывая творчасць, а не завучванне. У студэнцкія гады гэта разуменне толькі ўмацавалася, канчаткова вызначыўшы яго шлях у навуку і педагогіку.

Першая праца – асістэнт вылічальнага цэнтра Белдзяржуніверсітэта, затым яму прапанавалі перайсці на факультэт прыкладной матэматыкі (1970 год), які толькі што ўтварыўся.

– Новы факультэт – асаблівая атмасфера. Працаваць было цікава, мы адчувалі сябе першапраходцамі, – кажа дацэнт.

Новай ступенню яго кар'еры стала запрашэнне на кафедру лікавых метадаў і праграмавання матэматычнага факультэта ў 1973 годзе. Гэтаму этапу ён прысвяціў 15 гадоў жыцця. Менавіта тут пад кіраўніцтвам М. А. Шэшкі абараніў кандыдацкую дысертацыю, якая паклала пачатак яго навуковаму кірунку.

У 1980–1990-я Масцяніца займаўся вылічальнай матэматыкай, спецыялізуючыся на набліжаных метадах рашэння інтэгральных ураўненняў (пачыналася з кандыдацкай). Сфера выявілася запатрабаванай на практыцы. Яму давялося выступаць на навуковых семінарах у Ваенна-паветранай акадэміі імя М. Я. Жукоўскага, у Казанскім універсітэце і Кіеўскім інстытуце кібернетыкі – там былі апаненты і вядучая арганізацыя. Распрацаваныя ім метады знайшлі прымяненне ў вырашэнні прыкладных задач, звязаных з разлікам аэрадынамічных характарыстык крыла самалёта і карпусоў падводных лодак.

У 1988 годзе Уладзімір Станіслававіч вярнуўся на факультэт прыкладной матэматыкі – ужо ў якасці дацэнта кафедры матэматычнага забеспячэння сістэм аўтаматызаванага праектавання. Там ён працаваў да 1999 года, пакуль не перайшоў на новы эканамічны факультэт да аднакурсніка і арганізатара факультэта М. М. Кавалёва. З тых часоў ён нязменна працуе на эканамфаку.

– Вядома, спачатку хапала бытавой неўладкаванасці. Эканамфак у першыя гады выкарыстоўваў аўдыторыі і навучальную базу іншых карпусоў БДУ. Але мы паступова раслі і развіваліся. Раней наборы былі сціплымі, цяпер іншыя маштабы, з'явілася шмат замежных студэнтаў. Працаваць у такім дынамічным асяроддзі – вялікае задавальненне, – разважае ён. Пра сваю адданасць БДУ расказвае з цеплынёй:

– Блізкія раяць нарэшце пайсці на заслужаны адпачынак. А я працую на паўтары стаўкі! Але для мяне гэта не цяжкая нагрузка, а сапраўднае пакліканне. Быць часткай калектыву БДУ – вялікі гонар.

Алена СВІНКО

БДУ 105

УНІВЕРСІТЭТ
20 кастрычніка 2026 года, №10 (2314)

ПАКАЛЕННЕ, ЯКОЕ ЗАХАВАЕ СЭНСЫ: МАЛАДЫЯ СУПРАЦОЎНІКІ БДУ ПРА БУДУЧЫНЮ ЎНІВЕРСІТЭТА

105 гадоў БДУ – гэта гісторыя, якую ствараліпакаленні выкладчыкаў, навукоўцаў і студэнтаў. У юбілейным выпуску мы ўспамінаем мінулае ўніверсітэта, расказваем пра яго сённяшні дзень і зазіраем у будучыню. А якой яе бачаць тыя, каму яшчэ належыць працягнуць гэтую гісторыю? Знаёмімся з маладымі супрацоўнікамі БДУ, уключанымі ў банк даных адоранай моладзі, – людзьмі, якія ўжо сёння фарміруюць універсітэт заўтрашняга дня.

АД ЦІКАВАСЦІ ДА ПРАФЕСІІ

Для **Канстанціна Сягодніка**, выкладчыка кафедры банкаўскага бізнесу і фінансавых тэхналогій эканамічнага факультэта, выбар БДУ быў асэнсаваным яшчэ ў школе. У 2020 годзе ён увайшоў у банк даных адоранай моладзі як прызёр міжнародных алімпіяд па матэматыцы. Цяпер Канстанцін рыхтуецца да паступлення ў аспірантуру БДУ. У выкладчыцкай працы яго найперш прыцягваюць зносіны са студэнтамі.



Канстанцін Сягоднік

Выкладчык эканамічнага факультэта

– Цікава слухаць зусім розных людзей з рознымі падыходамі да многіх пытанняў, – адзначае Канстанцін.

Макар Хартон выкладае на фізічным факультэце: праводзіць практычныя заняткі па механіцы і лабараторныя работы па электрычнасці. Яго навуковыя інтарэсы звязаны з матэматычным мадэляваннем і вылічальнай фізікай.

Макар скончыў фізічны факультэт і магістратуру БДУ з адзнакай, удзельнічаў у навуковых канферэнцыях і алімпіядах, займаўся падрыхтоўкай школьнікаў. У банк даных адоранай моладзі ён уключаны дзякуючы даследчай, метадычнай і асветніцкай дзейнасці.

– Фізіка – гэта ўніверсальная мова, на якой размаўляе прырода, – гаворыць Макар.

Для яго важна не толькі даследаваць заканамернасці навакольнага свету, але і навучыць іншых іх разумець.

Юлія Гурыновіч ужо чатыры гады працуе спецыялістам вучэбнага цэнтра адукацыйных і інфармацыйных тэхналогій філалагічнага факультэта. Яна кіруе студэнцкай прэс-службай факультэта, курыруе праект «Студэнт БДУ на тыдзень» і арганізуе Калядны дабрачынны баль.

Юлія трапіла ў банк даных адоранай моладзі як лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы навучэнцаў і студэнтаў у 2025/2026 навучальным годзе.

Асаблівае значэнне для яе прафесійнага станаўлення мела выкладчыца Вольга Пятроўна Крычко.

– Яна навучыла мяне бачыць за вучэбнымі планамі і залікоўкамі жывых людзей, – расказвае Юлія.

Гэты прынцып вызначыў яе стаўленне да працы ва ўніверсітэце: выкладчыкі і супрацоўнікі факультэта павінны не толькі вырашаць арганізацыйныя задачы, але і ўмець падтрымліваць студэнтаў, заўважаць іх патэнцыял і дапамагаць ім развівацца.

ТЭХНАЛОГІІ ЗМЯНЯЮЦЬ АДУКАЦЫЮ

Маладыя супрацоўнікі БДУ працуюць у час, калі штучны інтэлект і лічбавыя інструменты змяняюць звыклыя падыходы да навучання.

Юлія лічыць, што сучасны выкладчык павінен сумяшчаць розныя ролі: даследчыка, арганізатара праектаў, папулярызатара навукі і спецыяліста ў галіне лічбавых тэхналогій. Пры гэтым маладое пакаленне не супрацьпастаўляе сябе старэйшым калегам, а працягвае іх традыцыі ў новых умовах.



Макар Хартон

Выкладчык фізічнага факультэта

Канстанцін таксама бачыць перспектывы ў змяненні адукацыйных методык. На яго думку, важна навучыць студэнтаў выкарыстоўваць штучны інтэлект не замест самастойнай працы, а для пошуку інфармацыі, дадатковай падрыхтоўкі і глыбейшага разумення тэмы.

Макар чакае, што штучны інтэлект і высокапрадукцыйныя вылічэнні стануць важнымі інструментамі навуковых даследаванняў. Зменіцца і роля выкладчыка: віртуальныя лабараторыі і інтэрактыўныя сімуляцыі дазволяць больш увагі надаваць развіццю крытычнага мыслення і навуковай інтуіцыі.

Аднак тэхналогіі не заменяць галоўнага – здольнасці самастойна думаць і задаваць пытанні.

– Жывыя зносіны, перадача захаплення навукай і ўменне задаць правільнае пытанне, на якое чалавецтву яшчэ толькі належыць знайсці адказ, – так Макар апісвае тое, што застанецца важным для адукацыі нават праз некалькі дзесяцігоддзяў.

ПЕРАДАЦЬ ЭСТАФЕТУ БУДУЧЫНІ

Макар хоча развіваць кірунак, які аб’ядноўвае фундаментальную навуку і адукацыю. Акрамя заняткаў у БДУ, ён працуе з навучэнцамі Ліцэя імя Ф. Э. Дзяржынскага і вячэрняга ліцэя.

Яго мэта – ствараць матэрыялы, якія дапамагаюць школьнікам і студэнтам не проста запамінаць формулы, а разумець, як навуковыя тэорыі працуюць на практыцы.

– Важна не толькі даць набор формул, але і навучыць фізічнаму мысленню, – тлумачыць выкладчык.

Для Юліі пытанне пра будучыню ўніверсітэта звязана найперш з захаваннем чалавечых каштоўнасцей. Уяўляючы юбілейную газету БДУ праз 50 гадоў, яна жадала б убачыць артыкул пра пакаленне, якое здолела прыняць тэхналагічныя змены, не страціўшы павагі да асобы і жывога слова.

– Мне хацелася б прачытаць артыкул пад загалоўкам «Пакаленне, якое захавала сэнсы», – гаворыць Юлія.

Яна спадзяецца, што будучыя пакаленні ацэняць здольнасць маладых супрацоўнікаў укараняць новыя тэхналогіі ў адукацыю, захоўваючы багацце мовы, культурную ідэнтычнасць і шчырасць зносін.

Канстанцін пакуль не бярэцца прадказваць, якім стане БДУ праз дваццаць гадоў. Але яму хацелася б, каб змяніліся падыходы да арганізацыі заняткаў і з’явіліся новыя метады працы са студэнтамі.



Юлія Гурыновіч

Спецыяліст вучэбнага цэнтра філалагічнага факультэта

Тры супрацоўнікі – тры прафесійныя кірункі, але агульная мэта: зрабіць адукацыю больш асэнсаванай, дапамагчы маладым людзям раскрыць свае здольнасці і захаваць ва ўніверсітэце прастору для самастойнага мыслення.

У год 105-годдзя БДУ іх погляды нагадваюць: гісторыю ўніверсітэта працягваюць не толькі вялікія адкрыцці і рашэнні. Яе ствараюць людзі, якія кожны дзень вучаць, даследуюць, падтрымліваюць студэнтаў і шукаюць новыя спосабы перадаваць веды наступнаму пакаленню.

Ксенія СМІРНОВА

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб’яўляе конкурс

на замяшчэнне пасад прафесарска–выкладчыцкага складу

Найменне пасады	Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі
Дацэнт	Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў.
Старшы выкладчык	Вышэйшая адукацыя і наяўнасць кваліфікацыі «Даследчык» (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені) і стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў.
	[2]Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў.
Выкладчык	Вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 1 год або вышэйшая адукацыя і наяўнасць кваліфікацыі «Даследчык» (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), без прад’яўлення патрабаванняў да стажу працы.

Эканамічны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:

Найменне пасады і кафедры	Тэрмін абрання на пасаду[1]
Дацэнт кафедры фінансавага кантролю, аналізу і аўдыту	1 год
Старшы выкладчык кафедры фінансавага кантролю, аналізу і аўдыту [2]	бестэрмінова
Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. К. Маркса, д. 31, каб. 65; да 18 лістапада. Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. К. Маркса, д. 31, каб. 65; да 18 снежня.	

Інстытут бізнес БДУ аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступнай пасады ПВС:

Найменне пасады і кафедры	Тэрмін абрання на пасаду[1]
Дацэнт кафедры фінансаў і менеджменту	2 гады
Месца (адрас) прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, каб. 203; да 18 лістапада. Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, аўд. 106; да 18 снежня.	

[1](дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

Гістарычны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад:

Найменне пасады і кафедры	Тэрмін абрання на пасаду[1]
Дацэнт кафедры гісторыі новага і найноўшага часу	5 гадоў
Дацэнт кафедры гісторыі Расіі	5 гадоў
Старшы выкладчык кафедры крыніцазнаўства (2)	бестэрмінова
Старшы выкладчык кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў	бестэрмінова
Выкладчык кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян	бестэрмінова
Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: гістарычны факультэт, вул. Чырвонаармейская, 6, аўд. 203; да 18 лістапада. Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: гістарычны факультэт, вул. Чырвонаармейская, 6, аўд. 208; да 18 снежня.	

Кафедра фізічнага выхавання і спорту аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступнай пасады ПВС:

Найменне пасады і кафедры	Тэрмін абрання на пасаду[1]
Старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту (11)	бестэрмінова
Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 8а, УСК «Універсітэцкі», каб. 215; да 18 лістапада. Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 8а, УСК «Універсітэцкі», каб. 224; да 18 снежня.	

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 20.10.2026 г.
Зак. 352. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
e-mail: gazeta@bsu.by; gazeta.bsu.by